40 260 11387
ш 05

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Выбаршчыкі заходніх абласцей БССР,
галасуйце за кандыдатаў Сталінскага
блока комуністаў і беспартыйных!
Работніца і калгасніца Беларусі № 23

Ніна Тарас

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Яшчэ ўчора слёзы пралівала гора,
Чалавек прытулку не знайшоў, не знаў,
Безработны плёўся ў гразкія прасторы,
Між бярозаў сонных маладосць губляў.
Часам над краінай журавы ляцелі
Восенню у вырай, а вясной назад.
І зімою вецер курганы мяцеліў,—
А мы выглядалі сонца з па-за крат.
І няволя жоўтай восенню мінула.
Ты, вялікі Сталін, даў свабоду нам.
Нават і старыя маладосць пачулі,
Як зачырванела полымем зара.
І сягоння ў краі будзем жыць шчасліва,
Дождж вясняны змые панскія сляды.
Зарастуць травою. І над вольнай нівай
Звонкім самалётам паплывуць гады.
А як скажаш,—выйдзем бараніць граніцы,
Выляцяць мільёны сокалаў у свет.
З перамогай слаўнай вернуцца ў сталіцу,
Ад людзей свабодных прынясуць прывет.

НА ЎСХОД ІДУЧЫ...

Шумелі, шумелі бярозы у гаю
Удзень і ўначы.
У вас я пра шчасце сваё запытаю
Удаль ідучы.
Скажыце,—ёсць многа дарог у краіне,
Шырокіх, вузкіх,—
Каторай дарогай сягоння пайсці мне,
Каб долю знайсці?
Шумелі, шумелі бярозы у гаю
У дзень і ўначы.
— Дарогу да шчасця ты знойдзеш у краі,
На ўсход ідучы.
Скажыце, ёсць песні, як сонная восень,
Як сум салаўя,
І звонкія песні пшанічных калоссяў.
Якую пяць?
— Ні той, што калоссем звініць на палетках,
Ні сумнае той.
Спявай, што ў маршы спяваюць сусветным,
Выходзячы ў бой.
Шумелі, шумелі, бярозы у гаю
Да позняй начы.
Знайшла я і песню, і долю у краі,
на ўсход ідучы.

За новую перамогу Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

15 снежня—дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях БССР. Гэту знамянальную дату працоўныя заходніх абласцей сустракаюць як народнае свята. Выбаршчыкі ўсе, як адзін, пойдуць да урнаў, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак перад радзімай—галасаваць за лепшых сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя органы ўлады.

Галасуючы за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, выбаршчыкі будуць галасаваць за народнае шчасце, за свабоднае, квітнеючае жыццё, якое ім на сваіх сцягах прынесла Чырвоная Армія і вялікая партыя Леніна—Сталіна.

Прайшло ўсяго 15 месяцаў з таго часу, як на вызваленай зямлі Заходняй Беларусі запалыхаў чырвоны сцяг свабоды, а якія велізарныя змены адбыліся ў жыцці працоўных!

Фабрыкі і заводы, зямля і яе нетры, банкі, якія належалі капіталістам, памешчыкам і банкірам, цяпер з'яўляюцца народным і дзяржаўным здабыткам.

Непазнавальнымі сталі заводы і фабрыкі, гаспадарамі якіх цяпер з'яўляюцца самі рабочыя. На прадпрыемствах установлена вентыляцыя, строга захоўваюцца ўсе правілы тэхнікі безапаснасці, створаны самыя спрыяючыя ўмовы для працы рабочых і работніц.

Яшчэ свежа ў памяці працоўных заходніх абласцей тое, як сотні тысяч людзей блукалі па вуліцах у пошуках работы. Уся гэта былая армія беспрацоўных працуе ўжо на совецкіх прадпрыемствах і ўстановах. Пушчаны ў эксплаатацыю дзесяткі раней закрытых прадпрыемстваў. Пабудаваны новыя фабрыкі. Канчаткова ліквідавана беспрацоўе.

Шпаркімі тэмпамі расце культура народа заходніх абласцей БССР. За гэты невялікі адрэзак часу арганізаваны тэатры—польскі, яўрэйскі, беларускі, рад гурткоў самадзейнасці. Выяўляюцца цудоўныя таленты сярод артыстаў, мастакоў, пісьменнікаў і інш. Паэты Танк, Пестрак, паэтэса Ніна Тарас і іншыя вядомы цяпер далёка за межамі Беларусі.

Пры панскай Польшчы іх праследвалі, яны былі загнаны за краты за тое, што ў сваіх вершах і песнях заклікалі народ на барацьбу з эксплаататарамі. Колькі тысяч такіх перадавых людзей у Польшчы за малейшае праяўленне рэволюцыйнай думкі гніло ў турмах і канцэнтрацыйных лагерах. Цяпер-жа яны складаюць цудоўныя песні аб совецкай рэчаіснасці.

Вось чаму з вялікім пачуццем захаплення вызвалены народ гаворыць аб сваім шчаслівым і радасным жыцці ў вялікай сям'і Совецкага Саюза пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Велізарную работу прарабілі партыйныя і совецкія арганізацыі заходніх абласцей БССР па выхаванню і вылучэнню кадраў. Да дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці прыцягнуты тысячы чалавек, сярод якіх вялікая колькасць жанчын.

А колькі новага ўнесла ў жыццё жанчыны совецкая ўлада. Праведзены такія мерапрыемствы, аб якіх працоўная жанчына ў мінулым і ўяўленя не мела. Для дзяцей арганізаваны яслі, дзіцячыя сады, малочныя кухні, дзіцячыя і жаночыя кансультацыі, дзіцячыя паліклінікі. Многадзетныя мацеры атрымліваюць дзяржаўную дапамогу. Толькі па двух абласцях—Брэсцкай і Пінскай—многадзетныя мацеры атрымалі 46 тысяч рублёў. Дзеці рабочых і сялян вучацца ў школах. Ці-ж гэта не радаснае жыццё для жанчын, калі праца іх спалучаецца з шчаслівым мацерынствам?

Жанчыны заходніх абласцей Беларусі, перанесшыя ў мінулым трайны гнёт—палітычны, эканамічны і бытавы, цяпер з'яўляюцца самымі актыўнымі будаўнікамі новага соцыялістычнага жыцця.

Лепшым прыкладам служыць тое, што на прадпрыемствах і калгасных палях шырацца рады стаханавак. Вось Ольга Ермаковіч толькі ў мінулым годзе пачала працаваць на лесараспрацоўках, а цяпер яна адна з знатных лесарубаў Беларусі. Уся брыгада, дзе працуе тав. Ермаковіч, з'яўляецца стаханаўскай. Тав. Оўчарэк—лепшая стаханаўка вагонных майстэрняў г. Брэста. Сара Дрыжун—ініцыятар стаханаўскага руху на Пінскай запалкавай фабрыцы. І многія другія жанчыны ўвасобілі ў сабе соцыялістычныя адносіны да працы.

У часе вылучэння кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных народ аказаў многім жанчынам вялікае давер'е, вылучыўшы іх кандыдатуры для балатыроўкі ў мясцовыя Советы. Усе яны з'яўляюцца перадавымі людзьмі і гарачымі патрыётамі нашай краіны.

З дня абвяшчэння выбарчай кампаніі ў заходніх абласцях разгарнулася вялікая агітацыйная работа сярод насельніцтва. У гэту пачотную работу ўключылася тысячная армія жанчын-агітатараў з мясцовага актыва. Яны зразумела і проста растлумачваюць выбаршчыкам самы дэмакратычны выбарчы закон у свеце—Сталінскую Канстытуцыю, Палажэнне аб выбарах. На прыкладах жыцця яны дэманстрыруюць перад працоўнымі велізарныя змены, якія адбыліся ў жыцці раней прыгнечанага народа за час совецкай улады.

Пасля выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных больш тысячы жанчын стануць актыўнымі дзяржаўнымі дзеячамі, якім народ даверыць кіраваць і рашаць дзяржаўныя справы. Абраннік народа—дэпутат павінен заўсёды памятаць, што ён з'яўляецца слугой народа, трымаць заўсёды сувязь з ім, адчытвацца перад народам аб сваёй дзейнасці.

Працоўныя заходніх абласцей БССР адзначаюць набліжэнне дня выбараў новымі вытворчымі поспехамі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

З такім-жа энтузіязмам яны 15 снежня будуць галасаваць за кандыдатаў непарушнага Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, памятаючы, што той, хто галасуе за Сталінскі блок, галасуе за радзіму, за адзінства народаў, за інтэрнацыянальную салідарнасць, за вялікую партыю Леніна—Сталіна, за лепшага друга ўсіх прыгнечаных народаў вялікага Сталіна.

ДАСТОЙНЫ КАНДЫДАТ

У сенцах раздаўся стук. Адчыніліся дзверы і ўвайшлі два паліцыянты і адзін у цывільнай вопратцы. У хаце паднялася суматоха. Паліцыянты пачалі раскідаць пасцелі, узрываць падлогу, біць пасуду... Знайшлі кніжкі—творы Маркса, Леніна, Чэрнышэўскага.

— Апранайся, хам!—злосна крыкнуў адзін з паліцыянтаў.

Міхаіл Манькоўскі не спяшаючыся апрануўся, абуў лапці і развітаўся з жонкай і дзецьмі.

Назаўтра, пасля арышту, быў суд над Манькоўскім у горадзе Ліда. Да памяшкання суда сходзіліся людзі. Паліцыя разганяла іх. Але людзей станавілася ўсё больш і больш. Супроць дома суда, на тратуарах суцэльнай лавінай стаялі людзі. Суд закончыўся. З дзвярэй паліцыя вывела чатырох зняволеных, закаваных у кайданы. Уперадзе зняволеных ішоў Міхаіл Манькоўскі. Ён убачыў сваю родную сям'ю: жонку, сына Міхася і дачку Лену, якія стаялі ўперадзе натоўпу людзей. Яны плакалі. Манькоўскі ішоў смела, бадзёра,—за праўду ён аддаваў сваё жыццё.

Вельмі цяжкімі былі мінуты, калі жонка і дзеці прышлі да Міхаіла на развітанне. Ручаём ліліся слёзы ў Лены, у яе маці і брата. Бацька не плакаў.

— Мяне сёння павесяць,— сказаў ён.—Жывога вы больш мяне не ўбачыце. Ольга, глядзі дзяцей. Вы дачакаецеся радаснага жыцця і ўспомніце мяне ў той час гордым словам. Леначка, ты любіш кветкі і я іх люблю. Садзі іх на маёй магіле. Бывайце здаровы і чакайце. Для вас узыйдзе яснае сонца...

Назаўтра для ўстрашэння сялян, паліцыя дазволіла забраць труп. Уся вёска сышлася на пахаванне. Дзеці неслі букеты кветак, вянкі, упрыгожвалі гроб Міхаіла Манькоўскага, задаўленага польскімі катамі. Маці, Лена і Міхась ішлі ўслед за прахам кармільца і аблівaліся слязьмі.

У горы, у нястачы і папроках за бацьку, Лена з маткай жылі 6 год. Зямлі было мала,—каля двух гектараў. Хлеб трэба было зарабляць. На работу нідзе не прымалі. Прыходзілася працаваць на самых цяжкіх работах, каб зарабіць на хлеб...

* * *

З вёскі на старадаўні шлях беглі людзі. Лена вышла з хаты і разам з натоўпам людзей спяшалася туды, адкуль даносіўся роў мататаў магутных танкаў і ўжо было бачна, як суцэльнай лавінай ішлі войскі. За некалькі крокаў Лена ўбачыла чырвоныя пятліцы, на шапках бліскучэлі звёздачкі. Яна разам з дзяўчатамі крыкнула голасна «ура!» Вочы яе свяціліся нейкай асаблівай радасцю. Сэрца білася з неймавернай хуткасцю. Дзяўчаты дарылі кветкі камандзірам і чырвонаармейцам. Прайшлі войскі. Апошняя двуколка знікла на завароце шырокага шляху. Доўга стаялі людзі і глядзелі ўслед вызваліцелям.

Лена бегла колькі ёсць сіл у вёску. Яна спяшалася паведаміць маці радасную навіну. Толькі адчыніла дзверы і голасна крыкнула:

— Мама, мама! — збыліся апошнія словы бацькі... Да нас прышлі чырвоныя...

Ад радасці маці абняла і пацалавала Лену...

Жыццё стала вольнае, вясёлае. Зімой сяляне вёскі Сялец доўгімі вечарамі гутарылі аб арганізацыі калгаса. Елена Манькоўская першай падала заяву і сказала:

— Я з маткай жадаем працаваць у калектыве.

Хутка быў арганізаван калгас. Закіпела ў ім дружная работа... Лена ўперадзе ўсіх у працы. За стаханаўскую работу яе любяць і паважаюць усе калгаснікі. З красавіка месяца і па першае лістапада Лена Манькоўская выпрацавала 300 працадзён...

Аднойчы ў вёсцы было вялікае ажыўленне. Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі ішлі на радасны сход для вылучэння кандыдатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных. На гэтым сходзе калгаснікі калгаса «Чырвоны сялец» і сяляне вёскі Сялец аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета Елену Міхайлаўну Манькоўскую.

А. Палякоў.

Лідскі раён
Баранавіцкай вобласці.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных—стаханаўкі, старшай строгальшчыцы 13-га тэкстыльнага камбіната М. М. Залістоўскай (у цэнтры) са сваімі выбаршчыкамі (56 выбарчая акруга, Пролетарскі выбарчы ўчастак № 14).
Фота А. Сапіра (Фотахроніка БЕЛТА).

Настаўніца

У школу зайшоў строга-чопарны інспектар Навак. Яго прыезд нічога добрага не абяцаў. Настаўнікі Талонкіны з хваляваннем стараліся даведацца аб сапраўднай прычыне прыезда суровага начальства.

Узбуджанасць і з'явілася прычынай таго, што настаўнік Талонкін, забыўшы аб прысутнасці інспектара, звярнуўся да сваёй жонкі Анны Ефрэмаўны на чыста рускай мове. Гэтага было дастаткова, каб інспектар Навак працадзіў скрозь зубы:

— Вы будзеце зволены па статуту.

Гэта сумная падзея застала Анну Ефрэмаўну ў школе вёскі Вароні. 17 год прапрацавала яна педагогам, а цяпер прыходзілася расставацца з любімай справай.

З вёскі Вароні тав. Талонкіна нікуды не ад'язджала. Ды і бяссэнсоўна было ва ўмовах нацыяналістычнага разгулу і чалавеканенавісніцтва ў панскай Польшчы шукаць спачування.

Пацягнуліся дні, тыдні, годы бязрадасныя і беспрасветныя, нібы чорная хмара ў асенняе надвор'е. Жыццё беспрацоўнага педагога здавалася замкнутым колам. Але жыць патрэбна было. І Анна Ефрэмаўна прыстасавалася да жыцця. Некаторы час была кухаркай, выконвала і іншыя работы, якія давалі мізэрныя сродкі для існавання.

Адна радасць была ў Анны Ефрэмаўны, якую польскія паны не ў сілах былі адняць—гэта вялікая і шчырая дружба з сялянамі.

Вёска Вароні нічым не адрозніваласа ад другіх вёсак Заходняй Беларусі,—яна знывала і вымірала пад ігам польскіх паноў. Кругом была страшэнная нішчата і як неадменны яе спадарожнік—каслівыя, вашывыя, абарваныя дзеці.

Падоўгу гутарыла Анна Ефрэмаўна з бацькамі і чым толькі магла старалася ім дапамагчы.

Трывожны стук у дзверы ўначы не быў выпадковай з'явай. Так ужо і павялося ў вёсцы Вароні, што калі зазірне ў хату няшчасце, то суцяшэнне і дапамогу ідуць шукаць у Анны Ефрэмаўны. І сяляне ведалі—усёй душой ім паспачувае настаўніца, яна раздзеліць з імі гора.

Уначы жонка Гашчука адчула сябе дрэнна—страціла прытомнасць, спалоханы муж прыбег да Анны Ефрэмаўны за дапамогай. Захапіўшы з сабой нашатырны спірт яны доўга з Гашчуком вазіліся, покуль не адратавалі хворую жанчыну.

Гэта невялікі штрых. А колькі такіх прыкладаў можна было-б прывесці з жыцця скромнай настаўніцы, якая самааддана і непрыкметна робіць дабро людзям?

Па вечарах Варанеўскія сяляне любілі пасядзець у Анны Ефрэмаўны. Гутарылі, газеты чыталі. Асабліва перад прыходам Чырвонай Арміі амаль кожны вечар да настаўніцы заходзілі Кірыдзей Мефодзій, Шульга Арцём і другія. У тыя памятныя вечары гутарка вялася вакол аднаго хвалюючага пытання: «А ці хутка да нас прыдзе Чырвоная Армія—вызваліцельніца?»

Суровую школу жыцця прайшла Анна Ефрэмаўна. Нарадзілася ў сям'і чыгуначніка. Бацьку страціла ў раннім дзяцінстве. Маці з сіл выбівалася, каб толькі як-небудзь выхаваць сваіх дзяцей. Старшы брат Іван дапамог падрыхтавацца і здаць экзамен за рэальнае вучылішча—экстэрнам. Атрымаўшы званне настаўніцы Анна Ефрэмаўна палюбіла педагагічнае майстэрства, усю душу ўкладаючы ў выхаванне сялянскіх дзяцей.

У кастрычніку мінулага года, калі на сходзе ў вёсцы Вароні абмяркоўвалася пытанне аб наладжванні жыцця на новых савецкіх пачатках, сяляне папрасілі, каб у школу настаўніцай узялі Анну Ефрэмаўну Талонкіну.

Пасля дванаццацігадовага перапынку т. Талонкіна зноў за сваёй любімай справай. Яна вядзе першы клас. Усе 33 вучні вучацца добра.

Летам гэтага года Талонкіна была на курсах перападрыхтоўкі. З прагнасцю вывучала яна ўсе прадметы, совецкія прынцыпы выхавання дзяцей.

Актыўны ўдзел прымае Анна Ефрэмаўна і ў грамадскім жыцці. Пры выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР працавала членам выбарчай камісіі, дапамагала сельсовету ў яго рабоце.

За чэснасць, скромнасць, за любоў да працоўнага народа, сяляне вёскі Белацін вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета.

Вестка гэта Анну Ефрэмаўну ўсхвалявала. Яна ціха прагаварыла:

— Сапраўды атрымліваецца: «Хто быў нічым, той стане ўсім».

Х. Зайцава.

Пінск.

Перадавыя людзі запалкавай фабрыкі імені 17 верасня (г. Пінск)—многастаночніцы і ініцыятары стахановскага руху на фабрыцы. Фабрычны калектыў аказаў ім вялікае давер'е—вылучыў у кандыдаты дэпутатаў працоўных. На здымку: Злева-направа: В. Ф. Любецкая, Р. П. Лазіцкая, М. К. Дашкевіч, Х. І. Боім, вылучаныя ў горсовет і Дрыжун С. М.—у абласны Совет.

Фота І. Рабіновіча

Актыў, выхаваны партыяй

Цёпла і па-сяброўску прайшла нарада жаночага актыва выбарчай кампаніі, скліканая 29 лістапада Брэсцкім гарадскім камітэтам партыі і рэдакцыяй нашага журнала. Удзельнікі нарады—людзі розных прафесій, рознага ўзросту. Усе яны ў гарачыя дні падрыхтоўкі да выбараў праводзяць многагранную работу сярод насельніцтва—расказваючы выбаршчыкам аб тых велізарнейшых зменах, якія адбыліся за пятнаццаць месяцаў совецкай улады на вызваленай зямлі.

Найлепшымі канкрэтнымі прыкладамі з'яўляюцца самі гэтыя жанчыны, іх жыццё, іх рост. Нельга было без хвалявання слухаць выступленне кожнай удзельніцы нарады, якое было прасякнута глыбокім пачуццем любві і ўдзячнасці партыі і краіне.

Многа год прапрацавала тав. Алексеюк пры панскай Польшчы, але большасць з гэтых год яна была чорнарабочай. Многія і гэтаму зайздросцілі. Працаваць дзе-б то ні было і кім бы то ні было—гэта-ж была мара тысяч беспрацоўных былой Польшчы. Цяпер тав. Алексеюк вылучана намеснікам загадчыка абласной прамысловай страхкасы. Яна старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у абласны Совет і кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета.

З запалам гаворыць яна аб новым жыцці, якое прышло разам з совецкай уладай. Расказвае аб праробленай рабоце, па падрыхтоўцы да выбараў і па-гаспадарску выкрывае недахопы, якія ёсць па выбарчай акрузе. Яны выявіліся перш за ўсё ў слабай падрыхтоўцы да сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі, у недастаткова прыстасаваным для гэтага памяшканні.

Вельмі прачуленым было выступленне супрацоўніцы банка тав. Пікало.

— Совецкая ўлада цягне чалавека ўверх,—гаворыць яна.—Калі мяне выбралі ў акруговую камісію я была шчасліва. Яшчэ большую і невыказную радасць адчула, калі на агульным сходзе мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета. Чым я гэта заслужыла?—пыталася я ў сваіх таварышоў. Чэснай работай,—адказвалі яны. Чэсна працаваць і быць да канца адданай сваёй радзіме—вось, што з'яўляецца галоўным для совецкага грамадзяніна,—заканчвае тав. Пікало.

Сярод актыва выбарчай кампаніі многа былых палітзняволеных. Гэта людзі, якія кроўю сваёй змагаліся з прыгнятальнікамі працоўных. Многа мы слухалі аб перажытых імі здзеках і ад кожнага новага расказа, кожнага эпізода сэрца б'ецца яшчэ большай нянавісцю к праклятым катам чалавецтва, мучыўшым лепшых прадстаўнікоў працоўных у засценках «Фардона», «Картуз-Бярозы» і другіх турмах і канцэнтрацыйных лагерах.

Работніцы швейнай фабрыкі «Атэлье мод» тав. Сухаліцкай толькі 28 год. Але якое цяжкае, поўнае нястач і барацьбы, жыццё перажыла яна да вызвалення былой Заходняй Беларусі з-пад панскага іга. Гэта скромны таварыш.—Чатыры годы прасядзела я ў турме, гэта-ж не так многа ў параўнанні з другімі,—гаворыць яна. Галадоўкі і турэмныя пратэсты добра знаёмы тав. Сухаліцкай. Аднойчы ў часе допыту ў яе ўлілі 8 літраў вады, але, не гледзячы на такое катаванне, яна нікога не выдала. Разам з вялікай групай жанчын за нежаданне адзець крымінальную вопратку 10 тыдняў праседзела яна зусім голай на турэмнай падлозе, нарах. Як многа ў гэтай жанчыны цяпер сіл, якое велізарнае жаданне працаваць не пакладаючы рук.

Добра памятае як праходзілі выбары ў панскай Польшчы работніца трыкатажнай арцелі тав. Оліс. 6 год яна праседзела ў турме за тое, што не хацела быць рабыняй, за тое, што змагалася з эксплаататарамі. Цяпер яе вылучылі кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета.

— Польскі ўрад,—гаворыць тав. Оліс, насаджаў нацыянальную варожасць, рабіў яўрэйскія пагромы. Як прыемна бачыць зараз, калі яўрэй агітуе за кандыдата ў дэпутаты паляка, калі паляк агітуе за рускага, яўрэя, украінца. У Совецкім Саюзе працоўныя ўсіх нацыянальнасцей раўнапраўны.

Дырэктар 13 яўрэйскай школы тав. Нарадоўская ў 1920 годзе атрымала званне настаўніцы, але мала давялося ёй працаваць у гэтай галіне ў былой Польшчы. Інспектар школ хутка даведаўся аб яе «неблаганадзейнасці». З вялікай рызыкай для сябе яна расказвала дзецям праўду аб Совецкім Саюзе, аб любімых правадырах і героях. З горада ў горад пераязджала тав. Нарадоўская, шукаючы работы. Яна—кваліфікаваная настаўніца была нянькай.

Якую вялікую змену ў яе жыццё прынесла совецкая ўлада! Цяпер яна дырэктар школы, дзе навучаецца 960 дзяцей. Яна актывістка выбарчай кампаніі, кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета.—Для чалавека ў адзін год,—гэта-ж вельмі многа шчасця,—гаворыць хвалюючыся тав. Нарадоўская.

15 снежня выбаршчыкі горада Брэста разам з усімі грамадзянамі заходніх абласцей будуць выбіраць дэпутатаў у мясцовыя Советы. Яны аддадуць свае галасы кандыдатам Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Сярод гэтых кандыдатаў будуць 58 жанчын, якія балатыруюцца ў Брэсцкі гарадскі Совет. Усіх іх—лепшых, адданейшых дачок народа выхавала партыя Леніна—Сталіна.

Брэст. **Каган, Шыфрына.**



У механічным цэху Лунінецкай чыгуначнай школы ФЗВ (Пінская вобласць), якая рэарганізавалася ў чыгуначнае вучылішча. За работай выдатніца вучобы В. С. Патоцкая.
Фота А. Вапульчыка (фотахроніка БЕЛТА).

Ёсць аб чым расказаць

Пятнаццаць месяцаў совецкай улады ў заходніх абласцях БССР. Колькі новага, колькі радаснага ўбачылі мы і перажылі за гэты час!

З жахам успамінаецца праклятае мінулае. Хоць я яшчэ вельмі маладая, але перажыць прышлося нямала. 15-гадовай дзяўчынай пайшла працаваць на фабрыку «Ардаль». Школу прышлося кінуць, бо трэба было зарабляць на хлеб.

У 1935 годзе, калі на фабрыцы выбухнула чарговая забастоўка, я далучылася да перадавых, свядомых членаў нашага рабочага калектыва, чаму і была зволена з прадпрыемства. Пасля гэтага была беспрацоўнай да прыходу Чырвонай Арміі, да вызвалення працоўных Заходніх Беларусі і Украіны ад гнёту польскіх паноў і капіталістаў.

Цяпер я, як і многія рабочыя, зноў вярнулася на фабрыку. Як добра працаваць, калі ведаеш, што твая праца карысная, што гэта ўсё для цябе, для любімай радзімы. Я з'яўляюся стаханаўкай, працую на двух аперацыях, план выконваю на 200 процантаў. За выдатныя поспехі ў рабоце ўзнагароджана значком «Выдатніку ўсесаюзнага спаборніцтва лёгкай прамысловасці СССР».

Мы цяпер карыстаемся выдатнымі правамі Сталінскай Канстытуцыі. У гэтым годзе фабком пасылаў мяне у дом адпачынку «Савейкі». Я атрымала добрую кватэру.

На фабрыцы ўступіла ў рады Ленінска-Сталінскага комсамола. Мне даверылі пачотную справу—быць намеснікам сакратара комсамольскай арганізацыі і прафоргам дзевятай ленты.

Радасныя, хвалюючыя дні перажываюць працоўныя заходніх абласцей БССР перад выбарамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Многа жанчын вызваленай зямлі прымаюць самы актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі. Мне таксама даручана адказная работа агітатара. Я праводжу заняткі з хатнімі гаспадынямі па вуліцы Свердлова горада Ліды. На канкрэтных прыкладах расказваю выбаршчыкам аб дасягненнях за час існавання совецкай улады. Нам ёсць аб чым расказаць! Колькі новага, колькі выдатнага зроблена за час совецкай улады пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам любімага правадыра працоўных таварыша Сталіна.

Многа перадавых жанчын, стаханавак прадпрыемстваў, калгасаў вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў. Мне народ таксама аказаў давер'е—вылучыў кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета. Я ад душы ўдзячна працоўным за гэта давер'е.

Хая Гіршаўна Кон.

г. Ліда.

За 15 месяцаў існавання совецкай улады ў Заходніх абласцях БССР выраслa многа выдатных агітатараў, якія нясуць большэвіцкую праўду ў масы. На здымку: Група агітатараў-комсамолак станцыі Столбцы, якія працуюць на выбарчых участках па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Злева-направа: Д. П. Бабкова—касірша, Л. І. Барэйка—старшы аператар і С. Н. Асадоўская—рахункавод (першы акалодак службы пуці станцыі Столбцы). Фота І. Рабіновіча.

Будзем галасаваць за лепшых людзей

Надыходзіць дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Да гэтай гістарычнай падзеі працоўныя Ляхавіцкага раёна рыхтуюцца з вялікім натхненнем. З першага дня перадвыбарчай кампаніі шырока разгарнулася агітацыйна-масавая работа. З асаблівай увагай працоўныя вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах.

Паспяхова прайшлі ў нас перадвыбарчыя сходы па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты. Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў працоўныя вылучылі лепшых людзей, адданых партыі Леніна—Сталіна. Сярод іх вялікая колькасць жанчын. Ёсць і ўдзельнікі нашага харавога гуртка. Многія з нашых гурткоўцаў працуюць старшынямі і членамі выбарчых камісій.

Члены сельгасарцелі імені Сталіна, Ляхавіцкага раёна, паслалі ў раённую выбарчую камісію сваю лепшую стаханаўку Надзежду Сідараўну Вайтуль. У склад Баранавіцкай абласной выбарчай камісіі ад комсамольскай арганізацыі абралі Марыю Іванаўну Рунт, ад рабочых і служачых фабрыкі «Ардаль»—Браніславу Грыгор'еўну Казлоўскую.

У дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных мы ўсе, як адзін, аддадзім свае галасы за лепшых людзей, праявіўшых сябе на практычнай рабоце.

Ольга Фёдараўна Праневіч.

Ляхавіцкі раён.

Паўліна Осіпаўна Майсюк

Цяжка жылося беластоцкім ткачам пад ігам фабрыканта. Яшчэ цяжэй было тым, хто працаваў у рабочых гарадках у Міхалаве, Васількове, Супраслі. Там эксплаатацыя прымала больш наглыя формы. Зарплата была зусім мізэрнай, над рабочымі з яшчэ большай сілай здзекваліся.

Міхалаўскі ткач Майсюк не мог пракарміць з грашовага заработка семярых дзяцей. Жонка выбівалася з сіл, дапамагаючы мужу—матала дома аснову, летам брала ў арэнду кавалачак зямлі пад агарод і бульбу. 11-гадовую дачку Паўліну прышлося забраць са школы і паслаць працаваць на фабрыку.

8 год працавала Паўліна Майсюк матальшчыцай. Але разам з непасільнай працай у яе развівалася класавая свядомасць. Радасна вітала ў 1920 годзе прыход Чырвонай Арміі, якая несла вызваленне ад эксплаатацыі, ад паліцэйскага і нацыянальнага гнёту. Са сцягамі, з чырвонымі бантамі вышлі рабочыя Міхалава насустрач вызваліцелям. Радасць цягнулася нядоўга. Банды Пілсудскага вярнуліся, жорстка помсцячы ўсім прыхільнікам совецкай улады. За ўдзел у дэманстрацыі тав. Майсюк арыштавалі. Два месяцы пратрымалі ў турме і выпусцілі да суда, а калі зноў за ёй прышлі, Паўліна Осіпаўна скрылася. Паўтара года пражыла яна нелегальна ў Беластоку. З вялікімі цяжкасцямі, пасля доўгіх беспрацоўных год удалося паступіць на работу вінтоўшчыцы на фабрыку.

Малодшы сынок фабрыканта, разлічваючы на сваю ўладу, на страх работніц перад скарачэннем і беспрацоўем, глядзеў на фабрыку, як на свой гарэм. Тав. Майсюк вымушана была кінуць сваё месца і паступіла на другую фабрыку.

Фабрыка працавала толькі 5—7 месяцаў у годзе. Муж тав. Майсюк, шавец, хварэў. Патрэбна было пракарміць шасцёра дзяцей і справіцца з хатняй работай. У дзяцей не было ні паліто, ні бацінак, прышлося іх забраць са школы. Паспрабавала Паўліна Осіпаўна устроіць на работу старшага сына, але для гэтага трэба было даць майстрам па крайняй меры 300—400 злотых, а без хабару і «пачастунку» яны не хацелі яго прыняць.

З мінулага года тав. Майсюк працуе на совецкім прадпрыемстве. Яе старшы сын прынят таксама на фабрыку. Спачатку ён быў істапніком, праз пару месяцаў пераведзен у слясарную майстэрню. Зараз тав. Майсюк атрымала новае назначэнне на пасаду памочніка майстра. Жанчына — памочнік майстра! Такое вылучэнне магчыма толькі ва ўмовах совецкай улады. Рабочыя выбралі Паўліну Осіпаўну ў цэхавы камітэт, паслалі ў Маскву на фабрыку «Трехгорная мануфактура» для падпісання дагавора па соцспаборніцтву.

У дні перадвыбарчай кампаніі рабочыя і інжынерна-тэхнічны персанал другога камбіната вылучылі тав. Майсюк кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Валенціна Сямёнаўна Найдус.

Беласток.

Выдатна правядзем выбары

Наша ўчастковая выбарчая камісія № 4 мабілізуе шырокі актыў для ўдзелу ў падрыхтоўчай рабоце да выбараў. З першага дня выбарчая камісія прыступіла да складання спісаў выбаршчыкаў. Праверылі і ўдакладнілі іх. Пасля падабралі адпаведны матэрыял для абсталявання ўчастка. На нашым участку балатыруюцца ў раённы Совет два кандыдаты, у гарадскі—7. За гэты час камісія засядала некалькі разоў. На пасяджэнні мы размеркавалі абавязкі паміж членамі камісіі, прымацавалі да акруговых выбарчых камісій членаў участковай камісіі, каб разам, агульнымі сіламі яшчэ лепш правесці перадвыбарчую кампанію.

Вялікую работу на выбарчым участку праводзіць агітацыйны калектыў. Асабліва праявілі сябе на рабоце лепшыя агітатары тт. Лебедзева, Семерніцкая, Грыгор'ева і інш. Яны правялі па некалькі заняткаў з хатнімі гаспадынямі. Падрабязна растлумачваюць ім пункт за пунктам Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, Канстытуцыі СССР і БССР.

Асабліва радасна тое, што жанчыны праяўляюць вялікую актыўнасць у выбарчай кампаніі. Вось, напрыклад, хатнія гаспадыні тт. Зільберквейт, Палонская і інш. збіраюць хатніх гаспадынь на заняткі гуртка. Жанчыны акуратна наведваюць сходы па сустрэчы выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі. Актыўна выступаюць на гэтых сходах.

На выбарчым участку былі праведзены сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты райсовета тт. Грамыкай і Літвінавай. У часе сустрэч выступала некалькі жанчын. Яны ў сваіх прамовах заклікалі выбаршчыкаў галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока камуністаў і беспартыйных. Яны гаварылі аб магутным Совецкім Саюзе, аб радасным жыцці працоўных краіны Советаў.

15 снежня—дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэту знамянальную дату працоўныя выбарчага ўчастка № 4, і ўсе выбаршчыкі заходніх абласцей БССР сустрэнуць, як вялікае свята ў сваім жыцці.

Броня Вансковіч–,
старшыня ўчастковай выбарчай камісіі № 4.

г. Столбцы.

Буду працаваць яшчэ лепш

Мне было 10 год, калі памёр мой бацька. Жыць было вельмі цяжка. Маці працавала ў памешчыка з рання да цёмнай ночы. Яе заработка не хапала нават на хлеб. Я вымушана была дзесяцігадовай дзяўчынкай пайсці працаваць. Працавала ў памешчыкаў Баневіча, Крэхавіцкага. Спачатку няньчыла дзяцей, потым мыла бялізну, падлогу, працавала на палявых работах. Нават марыць аб вучобе і набыцці кваліфікацыі ў той час было мне недаступна.

Толькі совецкая ўлада дала працоўным заходніх абласцей радаснае і культурнае жыццё. З прыходам Чырвонай Арміі я паступіла працаваць у Галоўныя вагонныя майстэрні ў якасці вучаніцы. Вучаніцай працавала ўсяго два месяцы, пасля чаго атрымала званне токара 3 разрада. З красавіка месяца гэтага года працую токарам 4 разрада. Вельмі люблю сваю работу і з гонарам выконваю яе. З кожным днём стараюся павышаць сваю кваліфікацыю.

Партыя Леніна—Сталіна забяспечыла мне шчаслівае жыццё. Жыву я культурна. Працую па-стаханаўску. Свае вытворчыя заданні выконваю больш чым на 150 процантаў.

Мне прадаставілі добры пакой. Да вялікага свята—XXIII гадавіны Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі, кіраўніцтва вагонных майстэрань прэміравала мяне абстаноўкай: сталом, крэсламі, ложкам і шафай.

Мне толькі 18 год, а як многа знамянальных падзей адбылося ў маім жыцці. Я—комсамолка, член пленума Брэсцкага гаркома комсамола, намеснік сакратара комсамольскай арганізацыі Галоўных вагонных майстэрань. У часе выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР працавала членам акруговай выбарчай камісіі. Цяпер працую старшынёй акруговай выбарчай камісіі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У гэтым годзе—у Сталінскі дзень чыгуначніка я ездзіла ў Маскву. Як многа цудоўнага я ўбачыла ў роднай нашай сталіцы! Радасна жыць пад яркімі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі, якая забяспечыла працоўным СССР усе благі жыцця.

Я павышаю свой ідэйна-палітычны ўзровень — вывучаю «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Часта бываю ў кіно-тэатрах.

З небывалай радасцю рыхтуюся к прадстаячым выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У гэтым годзе першы раз у сваім жыцці буду выбіраць сваю родную ўладу. Я з гонарам аддам свой голас за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Калектыў рабочых і служачых Галоўных вагонных майстэрань вылучыў мяне кандыдатам у дэпутаты Брэсцкага гарадскога Совета. Калі я даведалася аб гэтым, радасці маёй не было канца. Вялікае давер'е народа я пастараюся апраўдаць яшчэ лепшай стаханаўскай работай.

Ольга Іосіфаўна Оўчарэк.

г. Брэст.

Група медыцынскіх работнікаў Ленінграда, удзельнікаў баёў з белафінамі, узнагароджаных медалямі „За боевые заслуги" (злева-направа): Н. М. Біндар, М. І. Грыгор'ева, Н. Г. Андрэева, А. М. Тюрына, Е. Н. Чэрняева і А. Ф. Федотава.

Фото Ф. Кіслова (Фото ТАСС).

ЛЮБЛЮ СВАЮ РАБОТУ

Народы заходніх абласцей Беларусі, згуртаваныя вакол большэвіцкай партыі, у другі раз будуць выбіраць сваіх дэпутатаў на аснове Сталінскай Канстытуцыі. Выбаршчыкі будуць галасаваць за лепшых сыноў і дачок свайго народа, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна.

Мне даручана вялікая і пачотная работа: я з'яўляюся намеснікам старшыні акруговай выбарчай камісіі № 21 па выбарах дэпутатаў у раённы Совет. З першага дня работы я прыступіла да складання спісаў выбаршчыкаў. Некалькі разоў правярала іх.

Я расказваю выбаршчыкам аб значэнні выбараў і тэхніцы галасавання. На занятках мы вывучаем выбарчы закон, Канстытуцыі СССР і БССР, пытанні бягучай палітыкі. Акрамя гэтага бываю ў кожнага выбаршчыка на кватэры, знаёмлю з аўтабіяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў.

З вялікай радасцю я чакаю дня 15 снежня. У гэты знамянальны дзень я—вызваленая жанчына, як і ўсе выбаршчыкі заходніх абласцей БССР, аддам свой голас за вялікую партыю Леніна—Сталіна, за любімую Чырвоную Армію, якая прынесла нам вызваленне, шчаслівае і радаснае жыццё.

Іда Зільберквейт, хатняя гаспадыня.

г. Столбцы.

За шчаслівае і радаснае жыццё галасуюць працоўныя заходніх абласцей Беларусі!

На здымках фота-нарыса: 1. У бібліятэцы Іванаўскага партыйнага кабінета Пінскай вобласці. Агітатар тав. Заруцкая Сіма (злева) за атрыманнем літаратуры да чарговых заняткаў у бібліятэкаршы С. А. Шульман. 2. Марыя Якаўлеўна Печка—лепшая стаханаўка па рамонту пуці. План выконвае на 200 процантаў (ст. Жабінка, Брэсцкай вобласці). 3. Марыя Рунт—сакратар Баранавіцкага абласнога камітэта комсамола, вылучана кандыдатам у дэпутаты гарадскога совета па 19 выбарчай акрузе. 4. Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Юхімук працуе старшынёй мясцкома 4-й дыстанцыі службы пуці на станцыі Жабінка. Цяпер яна праводзіць вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На здымку: справа налева тав. Юхімук, тэхнік-нарміроўшчык Е. Т. Аўсянікава, тэхнікі дыстанцыі Е. Я. Бердзіна і В. Я. Крапотава. 5. Цыля Майсееўна Волковельская, комсамолка, працуе бухгалтарам Пінскага судна-рамонтнага завода. Вылучана кандыдатам у дэпутаты горсовета па 14 выбарчай акрузе. 6. Кандыдат у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Ю. І. Якімовіч—брыгадзір калгаса „Новае жыццё" Голынскага сельсовета, Сапоцкінскага раёна (Сапоцкінская выбарчая акруга № 80, Беластоцкая вобласць). 7. Маладзёжная жаночая брыгада лесарубаў Сталбцоўскага леспрамгаса, якая ўключылася ў соц-спаборніцтва на дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Совет дэпутатаў працоўных, паказваючы добрыя ўзоры работы. Штодзённа яны выконваюць план на 150 проц. На здымку: Брыгадзір гэтай брыгады Ольга Вікенцьеўна Жагаловіч. 8. Ядвіга Фёдараўна Зубрыцкая—стаханаўка 5-га тэкстыльнага камбіната (г. Беласток), кандыдат у дэпутаты Беластоцкага горсовета. 9—10. У горадзе Столбцы, у памяшканні, дзе раней знаходзілася польская дэфензіва, цяпер знаходзіцца дзіцячая кансультацыя. На 9 здымку: унешні выгляд кансультацыі, на 10 здымку—тав. Памоліс са сваёй дачуркай прышлі на кансультацыю да ўрача В. Ф. Сабалеўскай. Ззаду стаіць сястра Я. І. Герль. 11. Нядаўна пабудаваная бальніца ў горадзе Брэсце.

Фота Рабіновіча, Грунтфеста, Грына.

Лесарубы

— Пры польскай уладзе ніхто са мною не лічыўся. Ды каго цікавіла такая бабылка, як я?— так расказвае брыгадзір жаночай брыгады лесарубаў Сталбцоўскага леспрамгаса Ольга Карлаўна Ермаковіч.

І ў яе словах адчуваецца вялікая праўда, а разам з гэтым радасць і гордасць за сябе, за сваю працу, за сотні такіх жанчын як яна, вызваленых нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй. Праца на адноўленай зямлі, праца не на эксплаататараў, а на сябе дала бліскучыя вынікі.

Глядзіш на гэтую бадзёрую, жыццерадасную жанчыну і нават не верыцца, што прайшло толькі 15 месяцаў з часу вызвалення Заходняй Беларусі з-пад панскага гнёту. А колькі ў яе энергіі, колькі бадзёрасці, колькі прагнасці працаваць так, як працуюць перадавыя жанчыны Совецкага Саюза!

Да прыходу Чырвонай Арміі тав. Ермаковіч была батрачкай.

— Мне прыходзілася,—расказвае Ольга Карлаўна,—хадзіць ад аднаго багацея к другому, каб зарабіць на кавалак хлеба.

Неўзабаве пасля вызвалення Заходняй Беларусі тав. Ермаковіч арганізавала брыгаду жанчын па ачыстцы леса ад галля, але гэта не задавальняла ініцыятыўную жанчыну. Яна рашыла працаваць на лесараспрацоўках па метаду знатных лесарубаў, прымяняючы лучковыя пілы. Ужо з першых дзён брыгада тав. Ермаковіч выконвала норму на 150—200 процантаў. У дзень 8-га сакавіка Ольгу Карлаўну прэміравалі, а ў жніўні месяцы накіравалі ў дом адпачынку. Упершыню ў сваім жыцці тав. Ермаковіч адчула на сабе такія вялікія клопаты.

Яна абяцала, што будзе працаваць яшчэ лепш, каб дабіцца вышэйшай прадукцыйнасці працы. Сваё абавязацельства тав. Ермаковіч выконвае: не менш 200 процантаў дзённай выпрацоўкі дае брыгада.

— Мы зараз выпрацоўваем больш, чым некаторыя мужчынскія брыгады,—з гордасцю заяўляе Ольга Карлаўна.—Вось на днях брыгада Міхаіла Міцкевіча загатаўлівала за дзень па 7 кубаметраў, а наша звяно—па 9 кубаметраў кожны, пры норме 4 кубаметры. Пры атрыманні заработнай платы нам многія зайздросцілі. Толькі за 10 дзён лістапада кожная з нас зарабіла па 220 рублёў. Многія думаюць, што лесаруб гэта чалавек з вялікай фізічнай сілай. Гэта няпраўда. Не ў фізічнай сіле справа. Трэба авалодаць тэхнікай, трэба быць адданай справе, якую выконваеш,—заяўляе тав. Ермаковіч.—І тады толькі будуць поспехі ў рабоце.

Жаночая брыгада лесарубаў сталбцоўскага леспрамгаса.
Злева направа: Ніна Карлаўна Крывель, Еўгенія Сільвестраўна Дземідовіч і Ольга Карлаўна Ермаковіч.

Тав. Ермаковіч спалучае сваю вытворчую працу з вучобай. Кожны дзень пасля работы да яе прыходзіць настаўнік, які займаецца з ёю. Зараз Ольга Карлаўна вылучана кандыдатам у дэпутаты Нікалаеўскага сельскага Совета.

Трэба спадзявацца, што яна апраўдае давер'е народа, калі яе выбяруць дэпутатам. Яна будзе выдатным дзяржаўным дзеячом, будзе працаваць так, як працуе цяпер на лесазагатоўках.

Р. Блях.

Столбцы

Заўсёды НАПАГАТОВЕ

Новая сістэма абучэння членаў Асоавіяхіма патрабуе, каб кожны баец умеў не толькі страляць з вінтоўкі, але і ўсебакова ўладаў вайсковымі ведамі.

Задача кожнай асоавіяхімаўскай арганізацыі—рыхтаваць дастойны баявы рэзерв для нашай Чырвонай Арміі, выхоўваць усіх працоўных у духу мабілізацыйнай гатоўнасці, у дасканалым веданні вайсковай справы.

Умела і арганізавана праходзяць ваенныя заняткі ў асоавіяхімаўскай арганізацыі калгаса імені Сталіна, Друцкага сельсовета, Талочынскага раёна. Асоавіяхімаўская арганізацыя калгаса налічвае 30 чалавек. Але члены Асоавіяхіма ніколі не замыкаюцца ў сваім цесным кругу. Заняткі заўсёды праходзяць з удзелам многіх калгаснікаў і калгасніц.

Жанчыны калгаса вельмі цікавяцца абароннай работай. У дні заняткаў рэгулярна з'яўляюцца на вучобу, удзельнічаюць у пераходах з процівагазамі. Актывістка абароннай работы пажылая калгасніца Варвара Купрыянцава здала нормы на значкі проціпаветранай і хімічнай абароны і «Гатоў да санітарнай абароны». Два абаронных значкі мае калгасніца Вера Беразнёва. Клаўдзія Купрыянцава і Маня Гвоздова паспяхова вывучылі ўсе часткі вінтоўкі.

У гуртку па вывучэнню санітарнай абароны займаецца 15 жанчын. Уся сістэма ваеннага абучэння калгаснікаў пабудавана па прынцыпу строгага індывідуальнага падыходу да кожнага чалавека. Людзі, якія служылі ў арміі, займаюцца па адной праграме, неваеннаабавязаныя—займаюцца па другой праграме.

Варашылаўскіх стралкоў у калгасе налічваецца 26 чалавек, значкістаў проціпаветранай і хімічнай абароны—30 чалавек, «Гатоў да працы і абароны»—6 чалавек.

Заняткі адбываюцца рэгулярна два разы ў тыдзень. У вызначаныя часы праводзяцца гутаркі і лекцыі на абаронныя тэмы.

Вялікую цікавасць праяўляюць усе калгаснікі да міжнародных пытанняў. На гэтыя тэмы ў гуртку таксама адбываюцца лекцыі і даклады.

Акрамя гурткових заняткаў асоавіяхімаўская арганізацыя калгаса праводзіць тактычныя вучэнні. У адных з такіх вучэнняў, якія былі арганізаваны раённым Советам, асоавіяхімаўская арганізацыя калгаса імені Сталіна заняла першае месца па раёну.

Калгаснікі добра памятаюць словы нашага любімага правадыра таварыша Сталіна аб тым, што «Неабходна ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку».

А. Фёдарава.

Талочынскі раён.

Санітарнае звяно групы самаабароны домаўпраўлення № 38 (г. Мінск). Удзельнікі ўсесаюзнага завочнага спаборніцтва А. І. Міран, М. І. Крылова, А. С. Апановіч, М. Я. Драпеза.

Адам Міцкевіч

У хутары Заоссе, недалёка ад Навагрудка, аднаго з гарадоў Совецкай Беларусі, 24 снежня 1798 года нарадзіўся вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч. У самым Навагрудку правёў ён свае дзіцячыя годы. Тут ён вучыўся ў дамініканскай школе, тут ён услухоўваўся ў народныя песні і казкі, якія на ўсё жыццё засталіся ў яго памяці і знайшлі водгук у яго паэтычнай творчасці.

16-гадовым юнаком Міцкевіч паступіў у Віленскі універсітэт на філалагічны факультэт. Ва універсітэце прагучэлі першыя вершы Міцкевіча, пачуўшы якія прафесар універсітэта Бароўскі ўсклікнуў: «Геній, геній, ён заззяе над нашай краінай!»

Каля двух год Міцкевіч у Коўна выкладаў у гімназіі лацінскую славеснасць. Там ён зачытваўся творамі Шылера, Байрона і Шэкспіра, якія аказалі на яго велізарны ўплыў. Там ён вандраваў па маляўнічых ваколіцах, па даліне, якую цяпер ведаюць як «Даліну Міцкевіча»; на камені сярод дрэваў захаваліся выразаныя Міцкевічам яго ініцыялы.

У Вільна, куды Міцкевіч вярнуўся з Коўна, вышлі ў 1822 годзе першы, у 1823 годзе другі зборнік яго твораў. У Вільна ён увайшоў у тайныя гурткі польскай моладзі.

Абвінавачаны ў канспіратыўнай барацьбе супроць царскага самаўладства, Міцкевіч быў арыштаван у 1823 годзе і заключан у Базільянскі манастыр.

К гэтаму часу Міцкевіч ужо апублікаваў «Балады і рамансы», першыя часткі паэмы «Дзяды», паэмы «Жывіла» і «Гражына». То было сапраўды новае слова ў польскай літаратуры.

Міцкевіч шукаў матывы для сваёй творчасці ў народнай паэзіі, шукаў у гісторыі народа вобразы, якія маглі-б служыць прыкладам для сучаснікаў. Ён намаляваў мужныя і цудоўныя вобразы Жывілы і Гражыны, якія адракліся ад асабістага шчасця для карысці сваёй радзімы. Ён напісаў «Оду да маладосці», стаўшую маніфестам маладога пакалення Польшчы: у гэтай одзе паэт заклікаў дзярзаць у сваіх імкненнях, аб'ednаць намаганні ў барацьбе за свабоду.

У музеі польскага пісьменніка Адама Міцкевіча ў г. Навагрудку.
Фота Грунтфеста.

Месяцы, праведзеныя ў турэмным зняволенні, умацавалі духоўныя сілы Міцкевіча. У 1824 годзе царскія ўлады прымусілі Міцкевіча пакінуць родныя краі і накіравацца ў Пецербург.

* * *

Міцкевіч з вялікай зацікаўленасцю аднёсся да ўсяго, што ўбачыў у Расіі, імкнуўся вывучыць мову і літаратуру рускага народа. Ужо ў першае кароткае прабыванне ў Пецербургу ён зблізіўся з перадавымі рускімі людзьмі таго часу, у прыватнасці з дзекабрыстамі—барацьбітамі супроць самаўладства—Бестужэвым і Рылеевым.

Цеснае збліжэнне з рускай культурай, з лепшымі прадстаўнікамі рускай літаратуры пачалося, калі ён пераехаў у Маскву. Тут ён пазнаёміўся з Пушкіным, Вяземскім, Баратынскім і інш. Ён прыцягнуў да сябе ўвагу жвавасцю свайго характару, шчырым паэтычным жарам, які прыводзіў у захапленне ўсіх, у тым ліку і Пушкіна.

Творы Міцкевіча перакладаліся ў Расіі многімі паэтамі на чале з Пушкіным.

Пасля «Крымскіх санетаў» Адам Міцкевіч напісаў у Расіі адзін з лепшых сваіх твораў—«Канрад Валенрод».

У 1829 годзе Міцкевіч выехаў з Расіі за граніцу.

Дружба Міцкевіча з Пушкіным, аснаваная на глыбокай узаемнай павазе, была захавана абодвума і ў годы разлукі. «Яны нядаўна падружыліся, але хутка душы іх зрадніліся, як дзве альпійскія скалы»,—успамінаў пазней Міцкевіч (верш «Помнік Пятра Вялікага»). «З ім дзялілiся мы і чыстымі марамі, і песнямі»,—успамінаў Пушкін. Несумненна, гутаркі Пушкіна і Міцкевіча датыкаліся самых складаных пытанняў не толькі літаратуры, але і палітыкі. Аб гэтым сведчыць хоць-бы некролаг Міцкевіча на смерць Пушкіна.

* * *

Міцкевіч пабываў у Берліне. Ён наведаў у Веймары Гётэ. Ён вандраваў па Італіі, захапляючыся помнікамі мастацтва.

Вестка аб паўстанні ў Польшчы застала Міцкевіча ў Італіі. Ён не верыў у перамогу паўстаўшых, усю зіму правёў яшчэ ў Рыме, але потым усё-ж накіраваўся да граніц Польшчы. Але,

калі Міцкевіч ў жніўні 1831 года прыехаў у Дрэздэн, паўстанне было ўжо амаль поўнасцю падаўлена.

Да жніўня 1832 года Міцкевіч пражыў у Пазнані ў Дрэздэне, а затым пераехаў у Парыж. У эміграцыі ён напісаў трэцюю частку «Дзядоў» і «Пана Тадэуша». Гэтыя два творы зрабілі бяссмертным яго імя.

У трэцяй частцы «Дзядоў» увасобіліся творчыя замыслы і ідэйныя лятуценні, якія паэт песціў на працягу многіх год.

У Міцкевіча былі вялікія літаратурныя замыслы. Ён збіраўся прадоўжыць «Дзяды», мяркуючы, што гэта будзе самым значным яго творам. Ён задумаў другую частку «Пана Тадэуша». Але ажыццявіць гэта Міцкевічу не ўдалося: яго клікала барацьба за вызваленне радзімы.

У 1832—1834 годах ён рэдагаваў газету «Польскі пілігрым» і змяшчаў у ёй палкія артыкулы, у якіх заклікаў да барацьбы супроць «старога парадку», заклікаў заглядаць у «сэрцы, і мыслі народных мас», да актыўных дзеянняў супроць дэспатычных урадаў Еўропы.

На некалькі год Міцкевіч падпаў пад уплыў містыка Тавіянскага, што вельмі цяжка адбілася на яго творчай дзейнасці. Але калі ва Францыі і ўсёй Еўропе ўзнялася рэвалюцыйная бура, Міцкевіч убачыў рэальны шлях барацьбы за свабоду чалавецтва і свайго народа.

У 1848 годзе Міцкевіч паехаў у Італію, каб арганізаваць польскія легіёны для барацьбы за свабоду Італіі і Польшчы. На працягу 1849 года ён рэдагаваў у Парыжы сацыялістычную газету «Трыбуна народаў», на французскай мове. У гарачых артыкулах, прасякнутых сапраўдным тэмпераментам таленавітага публіцыста, ён асуджаў буржуазныя ўрады, палка вітаў працоўныя масы, якія падняліся на рэвалюцыйную барацьбу.

У 1855 годзе Міцкевіч паехаў у Канстантынопаль, каб арганізаваць там польскія легіёны супроць царскай Расіі. У Канстантынопалі ён захварэў лютаваўшай там халерай і памёр 26 лістапада 1855 года.

Так абарвалася жыццё вялікага польскага паэта, аб якім Роза Люксембург пісала, што калі-б Польшча ў сваёй літаратуры не магла назваць ні аднаго імені, акрамя гэтага паэта, то і тады яна была-б у праве заняць у сусветнай літаратуры пачэснае месца побач з культурнейшымі нацыямі.

Совецкі народ глыбока ўшаноўвае таленавітага мастака слова, гуманіста і барацьбіта, які шчыра марыў

„...о временах грядущих,
Когда народы, распри позабыв,
В великую семью соединятся"
(Пушкин).

Совецкі народ горды радасным сазнаннем, што сапраўднасць пераўзышла мары паэта: у шматнацыянальным Совецкім Саюзе вялікая сям'я народаў, спаяная непарушнай сталінскай дружбай, будуе шчаслівае жыццё, якое не магло намаляваць нават смелае ваабражэнне празорлівага паэта.

М. Жываў.

СЕЛЬСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

Вялікай папулярнасцю сярод калгаснікаў, вучняў і служачых карыстаецца бібліятэка пры доме соцкультуры сельскага пасёлка Камарына. Штодзённа бібліятэку наведвае больш 70 чалавек. Актыўнымі чытачамі з'яўляюцца калгаснікі і калгасніцы. Так, напрыклад, калгасніца сельгасарцелі «Серп і молат» тав. Пашчанка за апошнія два месяцы прачытала такія кнігі: «Адвержаныя» В. Гюго, «Як гартавалася сталь» Астроўскага, «Бацькі і дзеці» Тургенева і інш.

Камарынская бібліятэка мае прыемны і ўтульны выгляд. Усе кнігі акуратна расстаўлены на полках. На сценах вісяць партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, партрэты рускіх класікаў і совецкіх пісьменнікаў.

Ёсць вітрына, дзе выстаўлена наглядная літаратура для вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Тут-жа на тумбачцы стаіць і картатэка з рэкамендуемай літаратурай па гісторыі нашай партыі.

У бібліятэцы налічваецца больш 10 тысяч кніг. Сярод іх творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, энцыклапедыі і мастацкая літаратура.

У часе прызыва ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў бібліятэцы была арганізавана выстаўка ваеннай і мастацкай літаратуры, вывешаны плакаты, лозунгі на абаронныя тэмы.

Бібліятэкарам тут працуе Марыя Аронаўна Аўруніна. За кароткі час сваёй работы яна заваявала аўтарытэт і павагу сярод чытачоў.

Г. Каплан.



Стаханаўка-тысячніца міжгародняй тэлефоннай станцыі Бабруйскага райаддзела сувязі Т. І. Касцюкевіч (Магілеўская абласць)
Фото М. Шкляра (Фотахроніка БЕЛТА).

Адам Міцкевіч

РЫБКА

(З народнай песні)

Дзеўчына сцяжынкай роснай
Прабягае лес высокі,
Трэпле вецер яе косы,
Заліваюць слёзы шчокі.

Яна к рэчцы прыбягае,
Горкі сум сюды прыносіць,
Рукі белыя ламае,
Па-над рэчкаю галосіць:

— «Ой, вы, жыхары рачныя
Мае сёстры—Свіцязянкі,
Слухайце, як стогне, ные
Сэрца здраджанай каханкі.

Пан мне вельмі палюбіўся,
Узяць за жонку прысягаўся,
Ды з княгіняй ажаніўся,
А над Крысяй насмяяўся.

Хай жыве шчасліва, у згодзе,
Хай пяшчотаў вып'е мора,
Толькі хай сюды не ходзіць
Насміхацца з майго гора.

Што для здраджанай каханкі
Ёсць яшчэ на свеце белым?
Дык прыміце, Свіцязянкі,
У абдымкі маё цела»...

Так прычытвае жалобна,—
Нікнуць словы жалю ў далях,—
У рэчку скокнула,—і дробна
Паплылі кругі па хвалях.

У той час агні мільгалі
Там, дзе панскі дом вялікі,
Госці ў пана танцавалі,
Надрываліся музыкі.

У гэты лямант невымерны
Даляталі плачу гукі.
І слуга пачуў іх верны,
І падняў дзіця на рукі.

І пайшоў няпэўным крокам
Ён туды, дзе гладзь рачная,
Дзе сплялася над затокай,
Нібы плот, лаза густая.

Стаў ля берага крутога
Над ракою нахіліўся,
Праказаў:—«Суціш малога,
Дай грудзей... Ах, дзе ты,
Крыся?»

— «Тут на дне, я верны
дружа»,—
Голас чуецца дзявочы,—
«Адранцвела я ад сцюжы,
Выядае жвір мне вочы.

Тут я маю сваіх служак,
Паміж хвалямі гуляю,
Ем пясок, каралы, мушак,
А расою запіваю».

Ды слуга не чуе тога,
Яшчэ ніжэй нахіліўся
Да ракі:—«Суціш малога,
Дай грудзей!.. Ах, дзе ты,
Крыся?»

Стала штосьці ў рэчцы біцца,
Зморшчылася гладзь рачная,
Замуцілася вадзіца,—
Раптам рыбка выплывае;
Над вадой мільгае іскрай,
Плаўнікі да руж падобны,
На галоўцы залацістай
Вочкі—нібы бісер дробны.

Страсянулася—на плечы
Косы русыя ўпалі,
Вочы, бы ў веснавы вечар
У небе зорачкі, заззялі;
Грудзі—яблык сакавіты,
Твар—яснейшы зор адвечных...
Падплывае да ракіты,
Да густых кустоў надрэчных,
І спявае памаленьку,
Да грудзей дзіцятка туліць:
— «Люлі, люлі, мой маленькі,
Люлі, мой маленькі, люлі»...
А калі дзіця суціхне—
На галінку кош павесіць,
Зноўку цела сваё сцісне,
Галаву і вочы зменшыць,
Зноў пакрыецца лускою,
У пер'е краснае ўбярэцца,
Плюсне ў воду—над ракою
Толькі рэха разнясецца.
Так і вечарам і ранкам,
Як слуга з дзіцём прыходзіць,
Кліч пачуўшы, Свіцязянка
Пакарміць дзіця выходзіць.

Толькі вечарам аднойчы
Затужыла рыбка-матка;
Час прызначаны пракрочыў,
А няма слугі з дзіцяткам.
Да ракі не мог прабрацца
Ён ніяк, бо той парою
Пан над рэчкай прагуляцца
Вышаў з жонкай маладою.
За кусты слуга схаваўся,
Прачакаў да зоркі ранняй
І ўсё-ж не дачакаўся
Ён звароту пана з пайяй.
З-пад рукі глядзеў ён доўга
У даль, дзе вольны шлях
праходзіць,
Дзень прайшоў—няма нікога
Шэры вечар надыходзіць.
Ноч паліла зоркі-свечкі,
І з дзіцяткам за плячыма
Падышоў слуга да рэчкі,
Сочачы здалёк вачыма.
Божа! Што на свеце стала?
Думае, спыніўшы крокі:
Там, дзе рэчка працякала,
Толькі жвір, ды роў глыбокі,
А на беразе ў шматочкі
Вопратка паноў парвана,
Не відаць на'т і слядочку
Ані пані, ані пана;
А ў затоцы пад вярбою
Нібы вырас камень белы—
Пахаваў ён пад сабою
Два людскіх забітых целы.
Задумённа і маўкліва,
Не крануўшы цішу словам,
Дзве гадзіны сіратліва
Прастаяў слуга над ровам,
І паклікаў:—«Крыся, Крыся!»
Рэха «Крыся» адказала,
Гукі рэха расплыліся,
І навокал ціха стала.
Не сустрэў ён рыбкі вочы
У лозах, дзе лісцё сплялося;
Галавой хіснуў ён тройчы,
Нібы праказаў: збылося.
Ён да коша нахіліўся,
Усміхнуўся ён малому,
Узяў яго, перахрысціўся,
І пайшоў паспешна к дому.

Пераклаў К. Цітоў.

Стопудовікі

У 1940 годзе калгасы Талочынскага раёна дабіліся новых выдатных поспехаў у барацьбе за высокі сталінскі ўраджай. Уключыўшыся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за стопудовы ўраджай зернавых з гектара, многія калгасы раёна не толькі выканалі, але і перавыканалі сваё абавязацельства.

Пры сярэднім ураджаі зернавых у 11 цэнтнераў па раёну перадавыя калгасы атрымалі ўраджай у два разы вышэйшы. Калгас «Перамога» з усёй плошчы пасеву зернавых культур сабраў у сярэднім па 17,5 цэнтнера з гектара. Калгас імені 12 з'езда КП(б)Б з плошчы 187 га сабраў па 17,1 цэнтнера з гектара. Калгас імені Кірава—па 17,7 цэнтнера. Такіх-жа рэзультатаў па ўраджайнасці ў гэтым годзе дабіліся і многія другія калгасы.

Цікава таксама адзначыць, што прырост ураджайнасці па пералічаных калгасах у параўнанні з мінулым годам складае 4—5 цэнтнераў на гектар, а ў параўнанні з 1938 годам вырас амаль у два разы.

Стопудовых ураджаяў зернавых культур з усёй пасеўнай плошчы калгасы дабіліся на аснове шырокага выкарыстання багатага вопыта Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, вопыта ефрэмаўцаў, унясення ўгнаенняў і перахода на правільны севазварот.

Акрамя гэтага выключна вялікую ролю ў павышэнні ўраджайнасці адыгралі працаваўшыя ў калгасах у гэтым годзе комплексныя звенні.

Так, напрыклад, звяно Купрыянец Надзі з калгаса «Перамога», Талачынскага гарадскога пасялковага совета, дабілася ўраджайнасці ячменю на сваім участку з плошчы 7 га па 32 цэнтнеры з кожнага гектара.

Звеннявая Літвінко з калгаса імені 12 з'езда КП(б)Б са свайго ўчастка плошчаю ў 5 га зняла па 27 цэнтнераў ячменя з гектара. Звеннявая Какошка Анюта з гэтага-ж калгаса атрымала яравой пшаніцы па 25 цэнтнераў з гектара.

Нядрэнных ураджаяў у гэтым годзе калгасы дабіліся і па тэхнічных культурах—ільну, а таксама па бульбе. Калгас «Перамога» атрымаў 190 цэнтнераў бульбы з гектара на плошчы 45 га. Калгас імені 13-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі — 185 цэнтнераў.

Калгас «Чырвоны пуцілавец» у гэтым годзе сабраў ураджай ільнонасення па 5,13 цэнтнера і па 5 цэнтнераў ільновалакна з кожнага гектара. Звеннявая-камсамолка Надзя Крышына на ўчастку свайго звяна атрымала па 5,6 цэнтнера ільновалокна і 5,5 цэнтнера ільнонасення з гектара. Яна-ж актыўны ўдзельнік у грамадскай рабоце.

Звеннявыя тт. Крышына, Купрыянец і Какошка высокіх ураджаяў дабіліся таму, што прымянялі на сваіх участках метады перадавой агратэхнікі. Так, напрыклад, звяно т. Крышынай лён пасеяла па двухгадоваму канюшынішчу, паднятаму ўвосень на зяблёва. Ранняй вясной унеслі на кожны гектар па тры цэнтнеры попелу, па 2 цэнтнеры суперфасфату і па 1,5 цэнтнера калійнай солі. Пасля двухкратнай культывацыі пасеялі лён перакрыжным спосабам па 150 кілограмаў насення на гектар.

У фазе «ёлачкі» лён падкармілі аміячнай селітрай па 80 кілограмаў на гектар. Правялі двухкратную праполку. Выцерабілі яго ў ліпені, разаслалі ў пачатку жніўня. У тым-жа месяцы паднялі са сцелішча. Здалі дзяржаве са свайго ўчастка ільнотрасты 48 цэнтнераў—на 8 цэнтнераў перавыканалі план. Астатнюю трасту апрацоўваюць сваім звяном у калгасе, каб здаць дзяржаве ільновалакном.

Звеннявая Купрыянец ячмень сеяла па бульбянішчы ільняной сеялкай, сартовым насеннем высокай якасці. Ранняй вясной перад успашкай унеслі ў глебу па 2 цэнтнеры суперфасфата і па аднаму цэнтнеру калійнай солі на гектар у перыяд кушчэння ячменю правялі падкормку аміячнай селітрай па 40 кілограмаў на гектар. Два разы прапалолі. Першы раз палолі ад пустазелля, другі раз—ад прымешак культурных раслін.

Усе пералічаныя калгасы і лепшыя людзі гэтых калгасаў—звеннявыя ўжо зацверджаны кандыдатамі ва ўдзельнікі Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1941 года.

Атрымаўшы багаты ўраджай у 1940 годзе калгасы распачалі актыўную падрыхтоўку да вясны будучага года, з тым каб у 1941 годзе дабіцца новых поспехаў у барацьбе за сталінскі ўраджай.

Е. Магілевец, аграном раённага зямельнага аддзела.

Талочын.

Сям'я калгасніка-стаханаўца сельгасарцелі імені Будзённага (Старобінскі раён, Мінская абласць) Д. Г. Пракаповіча.

За 11 месяцаў тав. Пракаповіч са сваёй старшай дачкой і жонкай выпрацаваў 1250 працадзён і ў бліжэйшы час атрымае разлік за сваю работу ў гэтым годзе.

Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

Эксплаататарская сутнасць рэлігійнага свята каляд

Сярод рэлігійных перажыткаў віднае месца займаюць рэлігійныя святы. Асабліва выдзяляецца снежаньскае свята—каляды і звязаныя з ім святкі. Расказана аб гэтым свяце ў рэлігійнай хрысціянскай кнізе евангеліі. У ёй гаворыцца, што бог зробленую ім першую пару людзей Адама і Еву пасяліў у раі, дзе яны жылі без працы, на ўсім гатовым. Але вось саграшылі першыя людзі; бог выгнаў іх з рая і прымусіў працаваць; так па вучэнню рэлігіі праца з'яўляецца праклёнам для чалавека. Асабліва па рэлігійнай казцы пакарана жанчына: яна аддана ў рабства мужчыне. Грэх першых людзей складаўся ў тым, што Ева, насуперак загаду бога, сарвала плод з аднаго дрэва, з'ела сама і дала з'есці мужу. Гэты «грэх» называецца ў рэлігіі першародным грэхам. Гэты грэх па тлумачэнню рэлігіі быў такі вялікі, што ніхто не мог вымаліць у бога даравання. Грэх гэты цягацеў над усім чалавецтвам.

І вось бог парашыў для вызвалення людзей ад першароднага, грэха самаму сабе прынесці ў афяру свайго сына. Гэты сын Ісус Хрыстос па евангельскай казцы нарадзіўся на зямлі ад жанчыны. Жыў на зямлі ў плоці чалавека, прапаведваў людзям новыя шляхі выратавання, рабіў цуды, падвяргаючыся праследванню з боку зямных улад, быў арыштаван, асуджан, аддан смяротнаму пакаранню на крыжы і пахаван, а затым цудоўна ўваскрос і вярнуўся да свайго нябеснага бацькі. Уся казка аб калядах з'яўляецца перажыткам дзікунства і рабства.

Галоўны змест калядаўскай казкі састаўляе пропаведзь класавага міру. Эксплаататары ў дні каляд стараюцца паказаць сябе сябрамі бедных людзей. Папы, ксяндзы і сектанцкія прапаведнікі ў дні каляд стараюцца напомніць веруючым працоўным, што хрыстос, быццам нарадзіўся для пакут, на якія ён пайшоў добраахвотна, каб смерцю пазбавіць людзей ад іх грахоў. Хрыста білі, на яго плявалі, распялі, грудзі пракалолі, а ён усё цярпеў. Гэтымі казкамі духавенства старалася ўнушыць працоўным, што іх пакуты нішто ў параўнанні з пакутамі самога бога. Працоўныя таму не павінны наракаць, не павінны працівіцца злу, бо толькі праз пакуты (і пры тым добраахвотныя) можна выратаваць сябе, заслужыць узнагароду на небесах.

Каму трэба, каб працоўныя былі паслухмянымі, пакорлівымі людзьмі? Усё гэта патрэбна тым, хто на крыві і пакутах працоўных стварае сабе багацці.

Каб умацаваць веру ў працоўных у казку аб калядах духавенства гаворыць ім, што хрыстос быў бядняк, нарадзіўся ў хляве на саламянай падсцілцы і што бацькі яго былі беднякі: бацька—плотнік, а маці—хатняя гаспадыня.

У краінах капітала свята каляды звычайна спраўляецца з вялікай урачыстасцю. Выключэннем з'яўляецца гэты год. Чэрчыль, прэм'ер англійскага ўрада, заявіў, што ў гэтым годзе каляды не будуць спраўляцца. Вядома не таму, што буржуазія перастала падтрымліваць веру ў хрыста, а таму, што цяпер, калі палае другая імперыялістычная вайна, буржуазія баіцца, як-бы хто не ўздумаў святкаваць, калі трэба «ў поце твару» працаваць дзень і ноч на карысць яе-ж—айчыннай буржуазіі.

Цяпер калі капіталізм корчыцца ў сваіх супярэчнасцях і калі вайна падвергла мільёны працоўных гібелі, ці ўзняў голас супроць вайны глава каталіцкай царквы папа рымскі Пій XII і архіепіскап Англіі? Нічога падобнага. Абодва яны гавораць, што вайна, якую вядзе Англія, з'яўляецца вайной справядлівай і гэтым хочуць апраўдаць Англію, галоўную падпальшчыцу вайны.

Сусветная папоўшчына, на чале з папай рымскім неаднаразова выкарыстоўвала вобраз хрыста і калядную казку для падрыхтоўкі новай інтэрвенцыі супроць СССР—бацькаўшчыны працоўных усяго свету. Так у 1930 годзе папа рымскі заклікаў маліцца за тых, хто падрыхтоўвае «новае нараджэнне хрыста ў СССР», г. зн. за тых, хто вядзе барацьбу супроць совецкай дзяржавы і імкнецца аднавіць у нашай краіне стары, памешчыцка-капіталістычны лад. Але не дапамаглі капіталістам малітвы папы рымскага. Расце і мацнее краіна Советаў. Калі амаль увесь капіталістычны свет ахоплен полымем вайны, мы жывем па-за вайной, а якое гэта шчасце быць па-за вайной!

У нашай краіне свята каляды патрэбна толькі прытаіўшымся ворагам працоўнага народа. Гэта свята ім патрэбна, каб перашкаджаць соцыялістычнаму перавыхаванню працоўных і трымаць тых з іх, якія яшчэ не пакончылі з рэлігійнымі перажыткамі, пад рэакцыйным уплывам рэлігіі.

У СССР няма ні прыгнечання, ні прыгнятальнікаў, таму ні совецкі народ, ні яго дзяржава не адчуваюць патрэбы ў паслугах царквы і рэлігіі, прызначэнне якіх—падтрымліваць эксплаататарскі лад, абманваць і адурманьваць свядомасць прыгнечаных і эксплаатуемых працоўных. Вось чаму ў СССР дзесяткі мільёнаў працоўных парвалі з рэлігіяй.

Даўгаполаў.

Пры Віцебскай МТС арганізавана аграхімлабараторыя, якая прыступіла да даследвання глебы калгасаў.
На здымку: Загадчык лабараторыяй комсамолка В. Е. Глушакова за вызначэннем утрымання азота ў глебе калгаса імені Кірава, Віцебскага сельсавета.
Фота І. Лосева (Фотахроніка БЕЛТА).

Прывучайце дзіця да чыстаты і парадку

Чыстата, свежае паветра, правільнае харчаванне, вясёлыя і цікавыя гульні і заняткі, своечасовы адпачынак — неабходныя ўмовы для здароўя, бадзёрасці і жыццерадаснасці маленькага дзіцяці. Для таго, каб дзіця расло здаровым, трэба і самаго яго прывучыць да чыстаты і парадку. Трэба выхаваць у яго звычку ўмывацца зранку і перад сном, мыць рукі перад ядой і кожны раз, як яны забрудзіліся. Вельмі важна прывучаць дзяцей паласкаць рот перад сном, дзённым і начным. А з 4—5 год дзіця трэба ўжо прывучыць штодзённа чысціць зубы, лепш за ўсё вечарам, перад сном.

У некаторых сем'ях іншы раз да 5—6 год дарослыя самі кормяць дзіця. Такія дзеці звычайна дрэнна ядзяць, абавязкова з угаворамі, з казкамі. З 2—3 год дзеці ўпаўне могуць самастойна есці, але трэба прывучаць іх есці акуратна, не разліваючы, не спяшаючыся і толькі за сталом.

Трэба паступова прывучаць дзіця апранацца і распранацца, захоўваць апратнасць свайго касцюма, прычосвацца, карыстацца насавой хусткай.

Ужо з ранняга дзяцінства, дзіця можа прывыкаць да таго, каб убіраць цацкі, кніжкі на месца, не накідаць смецця, выціраць ногі пры ўваходзе ў дом.

У дзіцяці павінен існаваць пэўны рэжым дня: своечасова есці, своечасова і дастаткова бываць на свежым паветры. Гэта захоўвае дзіця ад стамлення, а таксама выхоўвае арганізаванасць, акуратнасць.

Ранні ўзрост, асабліва дашкольны, ад 3 да 7 год,—самы падыходзячы час, калі найбольш лёгка можна выхаваць у дзіцяці культурна-гігіенічныя навыкі.

Надзежда Канстанцінаўна Крупская любіла прыводзіць такі прыклад: «Санітарныя звычкі прывіваюцца дзетвары,—гаварыла яна.—Аднойчы ў Орэхава-Зуеве я ўвайшла ў дзіцячы сад у паліто. Рэбяты стаялі ў чарзе—ішлі мыць ручонкі. Адна дзяўчурка год пяці зірнула на мяне і гаворыць: «Цёця, ты парадкаў не ведаеш, нельга ўваходзіць у пакой у паліто».

Такія звычкі, выхаваныя ў дзіцяці ў дзяцінстве, захоўваюцца ў яго на ўсё жыццё.

Вельмі важна прывучаць дзіця рабіць самаму тое, што ўжо яму па сілах. Гэтага не прыходзіцца асабліва дабівацца. Дзіцяці дастаўляе вялікае задавальненне зрабіць што-небудзь самастойна. Кожны назіраў як дзіця настойліва патрабуе: «Я сам!», «Сам апрануся!», «Сам памыюся!» І велізарным бывае засмучэнне дзіцяці, калі дарослыя спяшаюцца ўсё зрабіць за яго. А між іншым такое жаданне дзіцяці ўпаўне законна: к 5—6 годам дзіця сапраўды здольна па свайму разумоваму і фізічнаму развіццю многае зрабіць для сябе самастойна.

Часта старшыя ў сям'і вельмі апекаюць дзіця, не давяраюць яго сілам, паступова яго спыняюць: «Ты яшчэ малы, ты яшчэ гэтага не ўмееш». У пачатку дзіця пратэстуе, але потым паволі ўціхамірваецца, прывучаецца карыстацца паслугамі другіх і нават знаходзіць у гэтым прыемнае для сябе.

Імкненне дзіцяці да самастойных дзеянняў павінна беражліва падтрымлівацца і сустракаць адабрэнне з боку акружаючых. Толькі ў тым, што дзіцяці заведама цяжка зрабіць, неабходна яму дапамагчы. Дзіцяці 3—4 год патрэбна яшчэ вялікая дапамога дарослых. Але прыцягваць яго, даваць яму прабаваць свае сілы абавязкова патрэбна. Дзеці старэйшыя 5—7 год, становяцца ўсё больш і больш самастойнымі.

Дзіця патрабуе цярплівых да сябе адносін. Канечна, яно ўсё робіць пакуль яшчэ павольна. Але трэба памятаць, што дзіця практыкуе свае сілы і што толькі такім шляхам можа развіцца самастойнасць у дзіцяці, якая яму потым так патрэбна будзе ў жыцці, таму не трэба спяшацца ўсё зрабіць самаму. Не трэба спяшаць і дзіця. Толькі больш старшых дзяцей, 6—7 год, якія ўжо многае навучыліся рабіць самі, можна прывучаць выконваць усё найхутчэй.

Для развіцця самастойнасці дзіцяці патрэбны і падыходзячыя ўмовы. Часта забываюць, што ўся хатняя абстаноўка прыстасавана толькі для дарослых і дзіця жыве ў ёй, як карлік сярод веліканаў. Дзіцяці-ж вельмі нязручна сядзець на звычайным крэсле за высокім сталом, есці вялікай лыжкай, з вялікай талеркі. Не дзіўна, што ён сам часта не можа справіцца з абедам, разлівае суп на абрус.

Высокі ўмывальнік, высока прыбітая вешалка для ручніка—усё гэта стварае перашкоды для дзіцяці і прымушае яго цалкам залежаць ад дарослых. Нярэдка і для цацак дзіцяці адводзіцца месца на высокім камодзе. Таму дзіця не ў сілах што-небудзь зрабіць без дарослых. Невыпадкова ў дзіцячых яслях і ў дзіцячых садах уся абстаноўка—сталы, стульчыкі, шафы, умывальнікі і т. д.—робіцца маленькай, па росту дзяцей. Гэта ўпаўне магчыма зрабіць і дома.

Дзіця павінна заўсёды бачыць прыклад культурных паводзін з боку акружаючых яго блізкіх людзей і бацькоў, братоў, сясцёр. Маленькае дзіця хутка і лёгка пераймае звычкі людзей, якіх ён любіць і з якімі жыве. Яму падабаецца ўмывацца «як папа» або «як мама». Як часта дзеці пераймаюць манеры бацькі, маці размаўляць, хадзіць, есці, апранацца. А ў рэзультаце гэтага пераймання ў дзіцяці ўмацоўваюцца пэўныя карысныя звычкі.

Дзіця навучаецца любіць чыстату и парадак таксама пад уплывам кніжак і малюнкаў.

Мастацкі, яркі вобраз, які даецца ў дзіцячай кніжцы, у вершы, у малюнку, добра даходзіць да дзіцяці, робіць вялікае ўражанне на яго.

Бацькі, любячыя сваіх дзяцей і жадаючыя выхаваць з іх здаровых і культурных людзей, павінны пры ўсіх умовах умець знаходзіць дастаткова часу для іх выхавання. **Д. Іоффе.**

Цэнтральны дашкольны навукова-метадычны кабінет.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх. Тэл.—24058

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3010. Тыраж 13.000 экз. У4812.
Здана ў друк. 7/XII—40 г. Падпісана да друку 10/XII—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

А.2 ФКБ
КРАСНОАРМЕЙСКАЯ 9
ГОСБИБ.КЕ

ЦАНА 20 КАП.

Лёс Александры Якаўлеўны Уласік быў падобен на лёс многіх жанчын былой панскай Польшчы. Не гледзячы на свой малады ўзрост яна доўгі час была беспрацоўнай. З прыходам совецкай улады яна паступіла ў Сталбцоўскае вагоннае дэпо ў якасці чорнарабочай. За год добра авалодала прафесіяй маляра пасажырскіх вагонаў. Цяпер з'яўляецца стаханаўкай. План выконвае на 170 процантаў. На здымку: Тав. Уласік за работай. Фото І. Рабіновіча.